# ІДЭЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ
# У ДРАМАТУРГІЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ У.КАРАТКЕВІЧА

Э.В.Садаўнічы

У.Караткевіч зусім правамерна лічыў, што выхоўваць у людзей любоў да нацыянальнай культуры можна адным толькі спосабам: выхаваннем у чалавеку гордасці за свой народ і яго дзеянні ў гісторыі. І ён заўсёды ўпарта і пільна шукаў і знаходзіў і ў сучасным жыцці, і ў гісторыі Беларусі такія падзеі і такіх асоб, якія б найбольш выразна выяўлялі істотныя рысы народнай душы і самыя высокія праявы народнага духу. Асабліва плённа пісьменнік справіўся з пастаўленай ім перад сабой задачай у драматургічных творах. У п'есах ён стварыў шырокія палотны народнага жыцця, намаляваў разнабаковы і глыбокі вобраз народа ў яго "множстве", паказаў выспяванне ў яго душы пратэсту супраць уціску, несправядлівасці, які выліваецца ў гнеўнае безаглядмае змаганне з гвалтаўнікамі і рабаўнікамі.

Усе галоўныя героі драматургічных твораў Караткевіча ў поўнай меры ўвасабляюць у сабе тыя галоўныя для беларуса якасці, якія адзначыў пісьменнік у нарысе "Зямля пад белымі крыламі", перш за ўсё – свабодалюбства. З зайздроснай непахіснасцю, нават апантанасцю яны адстойваюць свой чалавечы гонар, вернасць сумленню ў змаганні за волю ў самых неспрыяльных, нават безнадзейных для сябе абставінах, не апускаючы ні рук, ні галавы да самага канца. І калі так надарыцца, то для іх смерць – гэта самы апошні крок, апошні значны учынак, якім яны як бы падагульняюць свой жыццёвы шлях, падводзяць рахунак сваёй чалавечай сутнасці. Такія – партызаны Андрэй і Марыся ў гераічнай драме "Млын на Сініх Вірах", прысвечанай барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне; Вастравух, пан Заруба, Каліноўскі ў трагедыі "Кастусь Каліноўскі"; Ропат, Вольха, Багуся і іншыя удзельнікі узброенага выступлення віцьбічаў 1623 г. супраць палітыкі уніяцкага арцыбіскупа Іасафата Кунцэвіча ў хроніцы "Званы Віцебска"; Васіль Вецер, яго маці Агна і жонка Надзея ў трагедыі "Маці ўрагану", дзе пісьменнік узнаўляе падзеі сялянскага паўстання Вашчылы ў Крычаўскім старостве ў 1743-1744 гг. Жыцце

і смерць гэтых і многіх іншых персанажаў п'ес Караткевіча прасякнута узнёслым гераічным пафасам.

Уяўленне аб свабодзе свае чалавечае асобы ад сацыяльнага ці палітычнага уціску ў свядомасці герояў твораў Караткевіча шчыльна зніттавана з асэнсаваннем альбо адчуваннем неабходнасці свабоды быць самім сабой, свабоды быць беларусам, жыць па традыцыях і звычаях роднага народа, бацькаўшчыны. Таму яны, бароначы сябе, бароняць і сваю Радзіму. У глыбока гуманістычнай канцэпцыі асобы ў пісьменніка жыццё чалавечае зліваецца з жыццём народным і толькі тады набывае сэнс і апраўданне. У "Кал•сці чатырох чараўніц" малады Янка Луцэвіч, па-свойму працягваючы справу Каліноўскага, занепакоены клопатам пра захаванне душы народнае і свае ўласнае, вырашае пайсці ў свет, каб спазнаць быццё народа ва ўсёй разнастайнасці і багацці яго праяў і адшукаць свой Голас, які б увабраў у сябе ўсе галасы роднай зямлі. Ён не лічыць, як ягоная маці, што кідае сваю зямлю. Наадварот, ён перакананы ў тым, што ён якраз ідзе да яе сплочваць свой доўг, бо нязмерныя перад ёю даўгі усіх тых, "хто умее пісаць і думаць".

Ацэнка жыццёвага шляху і творчасці Янкі Купалы, дадзеная ў п'есе Караткевічам, цалкам дапасуецца да самога пісьменніка. Мы цяпер можам з упэўненасцю сказаць, што жыццё і творчасць гэтага выдатнага мастака і чалавека ўсё больш зліваецца з жыццём яго роднага народа, для абуджэння і адраджэння душы якога ён столькі зрабіў.

## ПРАБЛЕМЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ У ТВОРЧАСЦІ В.АДАМЧЫКА

Н.Л.Суддзева

Сярод праблем, якія ўздымаюцца сучаснай беларускай літаратурай, праблемы нацыянальнай гісторыі, бадай што, найбольш важкія. Што датычыцца творчасці В.Адамчыка, то яна практычна ўся скіравана на вырашэнне менавіта гэтых праблем. Прынамсі, самыя буйныя творы пісьменніка – "Чужая бацькаўшчына" (1978), "Год нулявы" (1983), "І скажа той, хто народзіцца" (1985), "Голас